# СКЛАД СЛОВА

**Успомніце**

З чаго складаецца слова?

## Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Корань слова

**181.** Прачытайце.

| | | |
|---|---|---|
| радасць | радок | радасць |
| весялосць | радыё | радасны |
| уцеха | радасць | радаваць |

Як называюцца словы першага слупка? Чаму?

Што агульнае ў словах другога слупка? Ці звязаны яны па значэнні?

**?!** Што аб'ядноўвае словы трэцяга слупка? Запішыце іх. Дапоўніце запіс уласным прыкладам.

**Словы з аднолькавай часткай, у якой заключаецца асноўнае для іх лексічнае значэнне, называюцца *роднаснымі*.**

**182.** Разгледзьце схемы. Якое слова прапушчана ў першай схеме, а якое — у другой?

звязаны па значэнні + маюць агульную частку → … словы

блізкія па значэнні + розныя па гучанні → …



Правообладатель Национальный институт образования

**183.** Прачытайце верш. Хто ўваходзіць у гусіную сям'ю? Якую добрую справу зрабілі гусі?

## Качаняты

Ходзяць гусі ланцужком:
гусачкі — за гусаком,
а за імі — гусяняты
і малыя качаняты.
Прытуліла, як свая,
іх гусіная сям'я.

*З. Марозаў.*

Спішыце. Знайдзіце ў вершы роднасныя словы, абазначце ў іх знакам ⌒ агульную частку.

Агульная частка роднасных слоў, якая перадае іх асноўнае лексічнае значэнне, — гэта **корань**. Роднасныя словы называюцца **аднакаранёвымі**.

**184.** Прачытайце. Знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Растлумачце свой выбар.

1. Качка, качаня, качы́ная, кача́цца.
2. Галубка, галубятня, прыгалу́біць, галубяня́.
3. Сава, саветнік, саві́ны, савяня́.

Запішыце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань.



Правообладатель Национальный институт образования

**185.** Разгледзьце «дрэва» аднакаранёвых слоў. Які корань яны маюць? Растлумачце значэнне кожнага слова.




*Творчая хвілінка*

Намалюйце сваё «дрэва» аднакаранёвых слоў з коранем *-зуб-* або *-грыб-*.

Растлумачце значэнне аднакаранёвых слоў. Пры неабходнасці карыстайцеся тлумачальным слоўнікам.

**186.** Прачытайце тэкст. Чым вас уразілі паводзіны буслоў? Чаму ў іх можна павучыцца людзям?

## Не пакінулі ў бядзе

На старую вольху прыляцелі **буслы**. Над вёскай пачуўся **птушыны** клёкат.

Вечарам усхадзіўся вецер. Цэлую ноч рыпела старая вольха. Пад **раніцу** ў дрэва зламалася верхавіна. Яна ўпала на зямлю разам з **буслянкай**.

**Уранку** над зламанай вольхай ужо кружыліся пяць пар буслоў. Яны пачалі майстраваць новае **гняздо** на гумне. **Птушкі** насілі на дах галінкі, мох.



Правообладатель Национальный институт образования

Праз дзень буслы работу закончылі. **Памочнікі** развітальна пакружыліся над гумно́м. **Гаспадары** засталіся.

Зноў вёску радаваў **буслiны** клёкат. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**гумно́** — гаспадарчая пабудова, у якой сушаць снапы, малоцяць збожжа

Падзяліце тэкст на часткі і складзіце яго план.

Якімі словамі аўтар называе ў тэксце буслоў? Сярод выдзеленых слоў знайдзіце і выпішыце аднакаранёвыя. Выдзеліце ў іх корань, растлумачце значэнне.

**Рм** Вусна перакажыце тэкст па плане, выкарыстоўваючы запісаныя аднакаранёвыя словы.

**187.** Адгадайце загадку. Спішыце.



**Хто зімы не баіцца?**

Убор у птушкі яркі.
Яна ад снежнай хмаркі
не адляцела ў вырай,
а дома, тут, дзе вырасла,
перазімуе зімку
з завеяй у абдымку.

*Л. Багдановіч.*

Знайдзіце ў загадцы аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань.

❖ Падбярыце да іх іншыя аднакаранёвыя словы і запішыце.



Правообладатель Национальный институт образования